**Белакурская Ж.Я. (Мінск)**

## Гукавы сімвалізм мастацкага тэксту (на матэрыяле паэзіі Максіма Багдановіча)

Традыцыйна ў большасці навуковых прац гукі мовы разглядаюцца як аднабаковыя адзінкі, якія маюць матэрыяльную фізічна-акустычную форму, але пазбаўлены ўласнага семантычнага зместу. У свой час М. Трубяцкой, распрацоўваючы тэорыю фанемы, падкрэсліваў яе функцыянальную значнасць у адрозненні, але не ў стварэнні сэнсу.

Яшчэ з часоў Платона і Арыстоцеля гучанне слова прыцягвала ўвагу філосафаў і тэарэтыкаў мовы не толькі ў сувязі з сэнсам, які яно афармляла, але і само па сабе. З цягам часу гукам пачынаюць прыпісваць уласную значнасць, што пазней пацвердзілі псіхалінгвісты і метадысты, адзначаючы, што вобразнасць слова, якая праяўляецца ў яго гучанні, надзвычай важная не толькі пры даследаванні мастацкіх вартасцей твора, але і ў навучальным працэсе, пры авалоданні мовай (у антагенезе), а таксама пры ўспрыняцці незнаёмага слова. Гукавая выразнасць і гукавы сімвалізм становяцца прадметам сур'ёзных філалагічных даследаванняў, сярод якіх сваёй метадычна-лінгвістычнай накіраванасцю вызначаецца праца А.П. Жураўлёва «Гук і сэнс», якая з'явілася адной з першых, дзе на канкрэтным моўным матэрыяле з прымяненнем новых (на той час) методык была рэалізавана ідэя аб змястоўнай сутнасці гукаў.

Удзячным матэрыялам для назірання з'яўляецца вершаваны тэкст, чытанне і ўспрыманне якога мае свае асаблівасці, абумоўленыя найперш асэнсаваннем функцыянавання ў ім лексікі. Між тым гук, рытм і інтанацыя, якія ўзаемадзейнічаюць у агульнай гукавой структуры верша, валодаюць не меншымі вобразна-выяўленчымі магчымасцямі. На думку В.У. Протчанкі, «паэт мае магчымасць так арганізаваць архітэктоніку мастацкага твора, што ў цэнтры ўвагі чытача аказваюцца найбольш важныя з пункта гледжання эстэтычнай вартасці дэталі, факты, падзеі, вобразы» [3, с. 139].

Здольнасць гукаў выклікаць розныя эмоцыі, адчуванні і сэнсавыя ўяўленні адным з першых заўважыў выдатны беларускі паэт М. Багдановіч, творы якога вызначаюцца надзвычай выразным вобразным і экспрэсіўным выкарыстаннем разнастайных прыёмаў гукапісу, што сведчыць пра існаванне ў багдановічаўскім радку сувязей паміж канататыўным зместам вершаванага тэксту і яго сумарным фанетычным значэннем. Пацвярджэннем гэтаму з'явіўся эксперымент, удзельнікамі якога сталі студэнты 1 курса спецыяльнасці «Руская філалогія» (усяго 50 чалавек). Спынімся на методыцы яго правядзення, якая прадстаўлена ў кнізе А. Жураўлёва «Гук і сэнс» [2].

Прадметам назірання сталі галосныя гукі.

На дошцы запісана 6 галосных гукаў: [а], [о], [і], [э], [у], [ы]. Студэнтам было дадзена заданне вызначыць, з якім колерам асацыіруецца кожны з гэтых гукаў. Вынікі эксперыменту паказалі, што ў большасці гук [а] суадносіцца з чырвоным колерам, [о] – з ярка-жоўтым ці белым, [і] – са светла-сінім, [э] – са светлым адценнем жоўта-зялёнага колеру, [у] – з цёмным адценнем блакітна-зялёнага колеру, [ы] – з цьмяным цёмна-карычневым ці чорным колерамі.

Цяжка сказаць, ад чаго залежаць гэтыя «каляровыя» ўласцівасці гукаў. Магчыма, гук [і] асацыіруецца з сінім колерам таму, што ўваходзіць у слова сіні,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

а [о] – таму, што ён прысутнічае ў слове жоўты. Але не толькі гэтае пытанне вартае ўвагі. Больш важна прасачыць тэндэнцыю ўжывання гукаў на прыкладзе вершаваных твораў, падлічыўшы частотнасць ужывання тых ці іншых гукаў у радках.

Матэрыялам для аналізу з’явіўся верш М. Багдановіча «Трыялет».

[мн’э до□□тӑ э рас та□н’ э з͡ ва□м’□
чарн’эй ад͡ ва□шых чо□рных ко□с/
чаму͡ ш н’ адо□бры час прын’ о□с
мн’э до□□тӑ э рас та□н’ э з͡ ва□м’ □/
ja□ пачарн’ э□ад͡ го□рк’□х с’ л’ о□с
ji͡ трыjал’эт пача□□слава□м’ □/
мн’э до□□тӑ э рас та□н’ э з͡ ва□м’□
чарн’эй ад͡ ва□шых чо□рных ко□с/] [1, с. 255].

У табліцы прыведзены вынікі падлікаў. Як рэкамендуецца ў такіх выпадках, націскныя галосныя памнажаюцца ў два разы.

| гук | націскны | ненаціскны | агульная колькасць ужыванняў |
|---|---|---|---|
| [а] | 12*2=24 | 18 | 42 |
| [о] | 11*2=22 | – | 22 |
| [ы] | - | 7 | 7 |
| [і] | - | 6 | 6 |
| [у] | 1*2=2 | - | 2 |
| [э] | 7*2=14 | 6 | 20 |

Такім чынам, па колькасці ўжыванняў (42) пераважае гук [а], затым ідуць гукі [о] і [э] (20).

Звернемся да сімволікі колераў. Гук [а], які адпавядае чырвонаму колеру, традыцыйна звязваецца з каханнем, [о] – светла-жоўты колер – сімвал расстання, [і], што адпавядае сіняму колеру, сімвалізуе лёгкасць, паветранасць. Сапраўды, менавіта гэтыя колеры адпавядаюць агульнаму настрою верша – лёгкаму, крыху сумнаму, спакойнаму.

Каб падмацаваць нашы назіранні, звернемся яшчэ да аднаго верша М. Багдановіча.

[разгара□ йс’ а хуч эй/ мой агон’ / м□ж͡ ымглы/
ха□ й ц’ аб’ эшум в’ атро□н’ э͡ пужа□ j э/
пагаша□j уц’ j аны аган’ оча□к малы/
а͡ в’алі’к’і крапчэй раздува□j уц’/
разгара□ йс’ а хуч эй/ з’□хац’□/ аган’ ок/
ка□ п/ кал’□j□зам’ ор ты б’ аз͡ дол’ □/
ўс’іх спужа□□͡ бы страшны апступ□шы j□х змрок/
ха□ й агн’ о□н’ э͡ гас’□л’□п н’□кол’ □/] [1, с 240].

| гук | націскны | ненаціскны | агульная колькасць ужыванняў |
|---|---|---|---|
| [а] | 9*2 = 18 | 28 | 46 |
| [о] | 10*2 = 20 | - | 20 |
| [і] | 7*2 = 14 | 6 | 20 |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| | | | |
|---|---|---|---|
| [ы] | 5*2 = 10 | 3 | 13 |
| [у] | 1*2 = 2 | 8 | 10 |
| [э] | 4*2 = 8 | 2 | 10 |

Сапраўды, агонь мае чырвоную і жоўтую афарбоўку, таму і гукі, якія суадносяцца з гэтымі колерамі, найбольш часта ўжываюцца ў вершы і выклікаюць адпаведны настрой. Калі чытаеш верш, перад вачыма ўзнікае малюнак вечаровага змроку, што і перадаецца спалучэннем цьмянага адцення карычневага, сіняга, блакітна-зялёнага колераў. І між імі, «між імглы», зіхаціць чырвона-жоўты агеньчык, што асвятляе наваколле і душу паэта.

Творчы шлях паэта завяршае невялікі верш. Нагадаем яго:

[ў∩ кра̦’і н̓ э с̓ в̓ этлай/ дз̓ эј а□ў м̓ і ра□ј у/
у∩б’элым дом’э / л’а∩с’ін’ай бухты /
ја□ н̓ э∩самотны/ ј а□ кн̓ □ту ма□ј у
з∩ друка□рн̓ і па□на ма□рц̓ і на кухты/] [1, с 320].

*Праецыруем нашы падлікі на гэты вершаваны твор.*

| гук | націскны | ненаціскны | агульная колькасць ужыванняў |
|---|---|---|---|
| [а] | 7*2 = 14 | 6 | 20 |
| [о] | 2*2 = 4 | – | 4 |
| [і] | 3*2 = 6 | 2 | 8 |
| [ы] | – | 4 | 4 |
| [у] | 2*2 = 4 | 5 | 9 |
| [э] | 3*2 = 6 | 3 | 9 |

Як бачна, у вершы традыцыйна дамінуе колер жыцця і кахання – чырвоны, дастаткова частотнымі з’яўляюцца светла-сіні, цёмныя адценні блакітна-зялёнага колеру, светлыя адценні жоўта-зялёнага – гэта значыць, у вершаваных радках як бы закадзіраваны колеры мора, якое так любіў М. Багдановіч.

Гукі ў паэзіі М. Багдановіча ствараюць цудоўную музыку. Яны – своеасаблівая партытура гульні фарбаў, якая дакладна перадае вобразнасць і экспрэсіўнасць твораў паэта. Узаемаабумоўленасць і ўзаемаадпаведнасць колеракодаў Багдановічавых паэтычных шэдэўраў абумоўлены культурнай традыцыяй народа і моўнай свядомасцю самога аўтара, што праяўляюцца як на сэнсавым узроўні, так і на ўзроўні асацыятыўных уяўленняў.

Размяшчаючыся на самым ніжнім ярусе будовы тэксту, гукі мовы ўносяць значны ўклад у павелічэнне змястоўнай ёмістасці мастацкага тэксту, садзейнічаюць стварэнню не толькі вобразнага, але і рэальнага адлюстравання рэчаіснасці.

**Літаратура**


1. Багдановіч, М. Поўны збор твораў : у 3 т. / М. Багдановіч. – 2-е выд. – Мінск, 2001. – Т. 1 : Вершы, паэмы, пераклады, наследаванні, чарнавыя накіды.
2. Журавлёв, А.П. Звук и смысл / А.П. Журавлёв. – М., 1981.
3. Протчанка, В.У. Актуальныя праблемы тэорыі і практыкі навучання беларускай мове / В.У. Протчанка. – Мінск, 2001.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ